Зарегистрировано в Национальном реестре правовых актов

Республики Беларусь 13 января 2009 г. N 5/29123

**ПАСТАНОВА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**10 студзеня 2009 г. N 18**

**АБ ГАНАРОВАЙ ГРАМАЦЕ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

(в ред. постановлений Совмина от 23.08.2014 N 817,
от 28.11.2014 N 1111, от 24.06.2017 N 471, от 23.11.2020 N 670,
от 13.05.2022 N 295, от 04.07.2022 N 444, от 13.07.2023 N 457)

На падставе часткі трэцяй артыкула 37 Закона Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 г. N 424-З "О Совете Министров Республики Беларусь" Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:
(в ред. постановления Совмина от 13.05.2022 N 295)

1. Зацвердзіць:

Палажэнне аб Ганаровай грамаце Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (прыкладаецца);

апісанне Ганаровай граматы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (прыкладаецца).
(п. 1 в ред. постановления Совмина от 13.05.2022 N 295)

2. Прызнаць страціўшым сілу пункт 2 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2004 г. N 12 "О Почетной грамоте Совета Министров Республики Беларусь" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2004 г., N 5, 5/13662).

3. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу з 1 студзеня 2009 г.

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь С.Сідорскі

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
10.01.2009 N 18

**ПАЛАЖЭННЕ**
**АБ ГАНАРОВАЙ ГРАМАЦЕ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

(в ред. постановлений Совмина от 23.08.2014 N 817,
от 28.11.2014 N 1111, от 24.06.2017 N 471, от 23.11.2020 N 670,
от 13.05.2022 N 295, от 13.07.2023 N 457)

1. Дадзеным Палажэннем рэгулюецца парадак узнагароджання Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (далей - Ганаровая грамата) грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства (далей, калі не вызначана іншае, - грамадзяне), калектываў работнікаў дзяржаўных органаў, іншых арганізацый Рэспублікі Беларусь і замежных дзяржаў, а таксама арганізацый Рэспублікі Беларусь і замежных дзяржаў (далей, калі не вызначана іншае, - арганізацыі і іх калектывы) за значныя заслугі ў дзяржаўнай, вытворчай, сацыяльна-культурнай дзейнасці, асобыя дасягненні ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, будаўніцтве, транспартнай і іншай дзейнасці, ва ўмацаванні законнасці, правапарадку

і абараназдольнасці Рэспублікі Беларусь.
(п. 1 в ред. постановления Совмина от 13.07.2023 N 457)

2. Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай грамадзян ажыццяўляецца арганізацыямі Рэспублікі Беларусь самастойна на падставе рашэння працоўнага калектыву.

Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай грамадзян можа ажыццяўляцца таксама па ініцыятыве Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, другіх дзяржаўных органаў, кіруючых органаў грамадскіх аб'яднанняў.
(в ред. постановления Совмина от 13.07.2023 N 457)

Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай грамадзян Рэспублікі Беларусь можа ажыццяўляцца пры ўмове, што яны ўжо былі ўзнагароджаны ці адзначаны граматамі і (або) падзякамі дзяржаўных органаў, арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, ці іх кіраўнікоў, за выключэннем:
(в ред. постановления Совмина от 13.07.2023 N 457)

асоб, узнагароджаных дзяржаўнымі ўзнагародамі, адзначаных Падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

кіраўнікоў (іх намеснікаў) рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь;
(в ред. постановления Совмина от 13.07.2023 N 457)

старшынь (іх намеснікаў) абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў;

работнікаў Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

асоб, якія прадстаўляюцца да ўзнагароджання Ганаровай граматай па ініцыятыве Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.
(часть третья п. 2 введена постановлением Совмина от 23.11.2020 N 670)

Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляецца на агульных падставах. Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пражываюць у іншых краінах, прадстаўляюцца органамі і арганізацыямі, пералічанымі ў частцы другой дадзенага пункта, да ўзнагароджання Ганаровай граматай па ўзгадненню з Міністэрствам замежных спраў.
(в ред. постановления Совмина от 13.07.2023 N 457)

Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай ажыццяўляецца з улікам звестак аб грамадзянах, атрыманых у тым ліку з адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях у парадку, прадугледжаным заканадаўствам.
(часть пятая п. 2 введена постановлением Совмина от 24.06.2017 N 471)

3. Прадстаўленні да ўзнагароджання Ганаровай граматай грамадзян, за выключэннем прадстаўленняў да ўзнагароджання Ганаровай граматай асоб, якія названы ў пункце 5 дадзенага Палажэння, арганізацыі Рэспублікі Беларусь накіроўваюць на ўзгадненне адпаведна ў раённы або гарадскі выканаўчы камітэт (мясцовую адміністрацыю), затым у абласны або Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт.

4. Узгодненыя прадстаўленні да ўзнагароджання Ганаровай граматай грамадзян накіроўваюцца арганізацыямі Рэспублікі Беларусь па падпарадкаванасці ў адпаведныя рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання і іншыя арганізацыі, падпарадкаваныя Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты, другія дзяржаўныя органы, кіруючыя органы грамадскіх аб'яднанняў, а для арганізацый, якія не маюць падпарадкаванасці, - у абласны або Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт па месцы знаходжання арганізацыі.
(в ред. постановления Совмина от 13.07.2023 N 457)

Названыя прадстаўленні разглядаюцца ў пералічаных у частцы першай дадзенага пункта органах і арганізацыях і ў выпадку прыняцця станоўчага рашэння ўносяцца для разгляду ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

5. Прадстаўленні да ўзнагароджання Ганаровай граматай Старшыні і намеснікаў Старшыні Усебеларускага народнага сходу і работнікаў яго Сакратарыята, членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікаў іх сакратарыятаў, суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і работнікаў яго Сакратарыята, суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і работнікаў яго апарату, работнікаў Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага сакратарыята Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь, Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Генеральнай пракуратуры, Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Следчага камітэта, Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, цэнтральных апаратаў Камітэта дзяржаўнага кантролю, Нацыянальнага банка, Нацыянальнага статыстычнага камітэта, членаў Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, работнікаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, работнікаў Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі і работнікаў яе апарату, Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей і работнікаў яго апарату, кіраўнікоў арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, ва ўстаноўленым парадку ўносяцца для разгляду непасрэдна ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.
(в ред. постановлений Совмина от 23.08.2014 N 817, от 23.11.2020 N 670, от 13.05.2022 N 295, от 13.07.2023 N 457)

6. Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай, за выключэннем дзяржаўных органаў і арганізацый, названых у пункце 5 дадзенага Палажэння, ажыццяўляецца:

калектываў работнікаў дзяржаўных органаў - вышэйстаячымі дзяржаўнымі органамі, а таксама другімі дзяржаўнымі органамі, кіруючымі органамі грамадскіх аб'яднанняў;

арганізацый і іх калектываў:

рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання і іншымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, ці другімі дзяржаўнымі органамі па ўзгадненню адпаведна з раённым або гарадскім выканаўчым камітэтам (мясцовай адміністрацыяй), затым з абласным або Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам;

абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі па ўзгадненню з раённым і гарадскім выканаўчым камітэтам (мясцовай адміністрацыяй).
(часть первая п. 6 в ред. постановления Совмина от 13.07.2023 N 457)

Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай арганізацый і іх калектываў можа ажыццяўляцца таксама па ініцыятыве Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.
(часть вторая п. 6 введена постановлением Совмина от 13.07.2023 N 457)

Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай калектываў работнікаў дзяржаўных органаў і іншых арганізацый замежных дзяржаў, а таксама арганізацый замежных дзяржаў ажыццяўляецца толькі па ўзгадненню з Міністэрствам замежных спраў.
(в ред. постановления Совмина от 13.07.2023 N 457)

Прадстаўленні да ўзнагароджання Ганаровай граматай арганізацый і іх калектываў накіроўваюцца ва ўстаноўленым парадку для разгляду ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.
(в ред. постановления Совмина от 13.07.2023 N 457)

7. Прадстаўленні да ўзнагароджання Ганаровай граматай, якія ўносяцца ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, павінны ўключаць:

суправаджальнае пісьмо;

праект пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб узнагароджанні Ганаровай граматай;

прадстаўленне згодна з дадаткам 1 або дадаткам 2;

даведку-аб'ектыўку, звесткі з адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях аб здзейсненых асобай правапарушэннях ці іх адсутнасці - пры прадстаўленні грамадзяніна;
(в ред. постановления Совмина от 24.06.2017 N 471)

даведку аб асноўных эканамічных паказчыках работы арганізацыі, якая вядзе гаспадарчую дзейнасць, за апошні год работы і справаздачны перыяд бягучага года ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года на дату прадстаўлення да ўзнагароджання Ганаровай граматай, узгодненую з адпаведным органам дзяржаўнай статыстыкі і падпісаную кіраўніком гэтай арганізацыі, - пры прадстаўленні грамадзяніна або арганізацыі Рэспублікі Беларусь.

8. Прадстаўленні ў адпаведнасці з дадаткам 1 або дадаткам 2 да дадзенага Палажэння запаўняюцца на беларускай мове машынапісным спосабам ці з выкарыстаннем камп'ютэрных тэхналогій. Усе пазначаныя графы прадстаўлення павінны быць запоўнены і змяшчаць дакладную інфармацыю.

Прадстаўленні ў адпаведнасці з дадаткам 1 да дадзенага Палажэння і даведкі-аб'ектыўкі падпісваюцца на:

грамадзяніна - кіраўніком арганізацыі;

кіраўніка арганізацыі - кіраўніком вышэйстаячай арганізацыі;

кіраўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей - намеснікамі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь згодна з напрамкамі, якія яны курыруюць.
(в ред. постановления Совмина от 13.07.2023 N 457)

Прадстаўленні ў адпаведнасці з дадаткам 2 да дадзенага Палажэння падпісваюцца кіраўнікамі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, другіх дзяржаўных органаў.
(в ред. постановления Совмина от 13.07.2023 N 457)

Прадстаўленні змацоўваюцца пячаткамі (пры іх наяўнасці) тых дзяржаўных органаў і арганізацый, кіраўнікамі якіх яны падпісаны.
(в ред. постановления Совмина от 13.05.2022 N 295)

9. Рашэнне аб узнагароджанні Ганаровай граматай афармляецца пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Ганаровую грамату падпісвае Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь або асоба, якая выконвае абавязкі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. На подпіс ставіцца адбітак пячаткі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь з відарысам Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.
(часть первая п. 9 в ред. постановления Совмина от 24.06.2017 N 471)

Грамадзянам уручаецца Ганаровая грамата і грашовае ўзнагароджанне ў памеры да 20 базавых велічынь або каштоўны падарунак на гэту суму. Выплаты ажыццяўляюцца за кошт сродкаў арганізацыі, у якой працуе грамадзянін, прадстаўлены да ўзнагароджання Ганаровай граматай.
(в ред. постановления Совмина от 28.11.2014 N 1111)

Арганізацыям і іх калектывам уручаецца толькі Ганаровая грамата.
(в ред. постановления Совмина от 13.07.2023 N 457)

10. Наступнае прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай магчыма не раней як праз пяць гадоў.

11. Ганаровая грамата і грашовае ўзнагароджанне або каштоўны падарунак уручаюцца Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь ці па яго даручэнню:

намеснікамі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь;

кіраўнікамі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання;

старшынямі абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў;

іншымі службовымі асобамі.

12. Ганаровая грамата і грашовае ўзнагароджанне або каштоўны падарунак уручаюцца асабіста грамадзяніну ва ўрачыстай абстаноўцы, а Ганаровая грамата арганізацыі (яе калектыву) - на ўрачыстым сходзе або пасяджэнні калектыву работнікаў гэтай арганізацыі не пазней як праз месяц з дня прыняцця

пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб узнагароджанні Ганаровай граматай.
(в ред. постановления Совмина от 13.07.2023 N 457)

Дадатак 1
да Палажэння
аб Ганаровай грамаце
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь

(в ред. постановлений Совмина от 23.11.2020 N 670,
от 13.05.2022 N 295, от 13.07.2023 N 457)

**ПРАДСТАЎЛЕННЕ**

1. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) ______________
2. Прафесія, пасада, месца працы (службы) ________________________________
__________________________________________________________________________
3. Чысло, месяц і год нараджэння __________________________________________
4. Грамадзянства __________________________________________________________
5. Адукацыя _______________________________________________________________
6. Ці ўзнагароджваўся, адзначаўся раней Падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Падзякай Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, граматамі дзяржаўных органаў, арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, ці падзякамі іх кіраўнікоў і даты ўзнагароджання, адзнакі
__________________________________________________________________________
7. Месца жыхарства або знаходжання і тэлефон ______________________________
__________________________________________________________________________
8. Агульны стаж работы (тэрмін службы) ____________________________________
Стаж работы (тэрмін службы) у дадзенай арганізацыі ________________________
9. Характарыстыка з указаннем заслуг, за якія прадстаўляецца да ўзнагароджання Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь
__________________________________________________________________________
10. Кандыдатура ___________________________ рэкамендавана для прадстаўлення
(ініцыялы (ініцыял уласнага імя), прозвішча)
да ўзнагароджання Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь
__________________________________________________________________________
(назва арганізацыі, дата абмеркавання, нумар пратакола)

Кіраўнік ___________________ ______________ __________________________
(назва арганізацыі) (подпіс) (ініцыялы (ініцыял уласнага імя), прозвішча)

__ _______________ ____ г.
М.П. <*>

--------------------------------
<*> Пры яе наяўнасці.

11. Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ________________________________________ падтрымліваюць:
(ініцыялы (ініцыял уласнага імя), прозвішча)

____________________________________ ____________________________________
(раённы, гарадскі выканаўчы камітэт (мясцовая адміністрацыя)) (абласны, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт)
____________________________________ ____________________________________

| | |
|---|---|
| (дата абмеркавання, нумар рашэння) | (дата абмеркавання, нумар рашэння) |

| | |
|---|---|
| Старшыня раённага, гарадскога выканаўчага камітэта (кіраўнік мясцовай адміністрацыі) | Старшыня абласнога, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта |
| (подпіс, ініцыялы (ініцыял уласнага імя), прозвішча) | (подпіс, ініцыялы (ініцыял уласнага імя), прозвішча) |

Дадатак 2
да Палажэння
аб Ганаровай грамаце
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь

(в ред. постановлений Совмина от 13.05.2022 N 295,
от 13.07.2023 N 457)

**ПРАДСТАЎЛЕННЕ**

1. Назва арганізацыі (яе калектыву) ________________________________________
_____________________________________________________________________________
2. Месцазнаходжанне _________________________________________________________
_____________________________________________________________________________
3. Заслугі, за якія прадстаўляецца да ўзнагароджання Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь _______________________________________
_____________________________________________________________________________

| Кіраўнік | ______________________________ | ________ | ____________________ |
|---|---|---|---|
| | (назва рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання, арганізацыі, падпарадкаванай Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, абласнога або Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, другога дзяржаўнага органа) | (подпіс) | (ініцыялы (ініцыял уласнага імя), прозвішча) |

__ _______________ ____ г.
М.П. <*>

--------------------------------

<*> Пры яе наяўнасці.

4. Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ______________________________________ падтрымліваюць:
(назва арганізацыі (яе калектыву)

| | |
|---|---|
| (раённы, гарадскі выканаўчы | (абласны, Мінскі гарадскі |
| камітэт (мясцовая адміністрацыя) | выканаўчы камітэт) |
| (дата абмеркавання, нумар рашэння) | (дата абмеркавання, нумар рашэння) |

| | |
|---|---|
| Старшыня раённага, гарадскога выканаўчага камітэта (кіраўнік мясцовай адміністрацыі) | Старшыня абласнога, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта |
| (подпіс, ініцыялы (ініцыял | (подпіс, ініцыялы (ініцыял уласнага |

уласнага імя), прозвішча)                    імя), прозвішча)

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
10.01.2009 N 18
(у рэдакцыі пастановы
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
13.05.2022 N 295)

**АПІСАННЕ**
**ГАНАРОВАЙ ГРАМАТЫ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

(введено постановлением Совмина от 13.05.2022 N 295;
в ред. постановлений Совмина от 04.07.2022 N 444,
от 13.07.2023 N 457)

1. Ганаровая грамата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (далей - Ганаровая грамата) уяўляе сабой папяровы ліст белага колеру шчыльнасцю 280 г/кв. м памерам 297 x 400 мм.

2. Па знешняму краю Ганаровай граматы размешчана паласа шырынёй 12 мм у выглядзе беларускага арнаменту залаціста-охрыстага колеру са знешнім перыметрам 285 x 383 мм і ўнутраным - 260 x 359 мм.

3. На Ганаровай грамаце ў цэнтры верхняй часткі на адлегласці 21 мм ад знешняга краю знаходзіцца Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь памерам 35 x 35 мм.

4. Ніжэй відарыса Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь на адлегласці 4 мм размешчаны надпіс залатога колеру ў тры радкі "ГАНАРОВАЯ ГРАМАТА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ". Вышыня літар - 12 мм (слова "ГАНАРОВАЯ"), 18 мм (слова "ГРАМАТА"), 7 мм (словы "САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ").

5. На адлегласці 20 мм ад радка са словамі "САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ" размяшчаецца тэкст аб узнагароджанні, які наносіцца друкарскім спосабам (вышыня літар - 3 мм). Ніжэй на адлегласці 15 мм друкарскім спосабам указваюцца ў два радкі прозвішча асобы, якая ўзнагароджваецца Ганаровай граматай (вышыня літар - 6 мм), уласнае імя і імя па бацьку (калі такое маецца) (вышыня літар - 4,5 мм) або назва арганізацыі (яе калектыву), якая ўзнагароджваецца Ганаровай граматай (вышыня літар - 6 мм).
(в ред. постановления Совмина от 13.07.2023 N 457)

6. У ніжняй трэці часткі Ганаровай граматы на адлегласці 55 мм ад ніжняга краю знаходзіцца выява Дома Урада на фоне светла-блакітнага колеру.

7. У ніжняй частцы Ганаровай граматы з левага боку літарамі залацістага колеру ў два радкі ўказваюцца словы "Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь" або асоба, якая выконвае абавязкі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь (вышыня літар - 3 мм). З правага боку друкарскім спосабам размяшчаюцца ініцыялы і прозвішча Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь або асобы, якая выконвае абавязкі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь (вышыня літар - 3 мм).

8. З левага боку пад назвай пасады асобы, якая падпісала Ганаровую грамату, указваюцца друкарскім спосабам у два радкі дата пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб узнагароджанні Ганаровай граматай і словы "г. Мінск" (вышыня літар - 2 мм).

9. Ганаровая грамата змяшчаецца ў металічную рамку са шклом памерам 305 x 405 мм і прымацоўваецца да яе кранштэйнамі.

(в ред. постановления Совмина от 04.07.2022 N 444)